БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Мікола МАЛЯЎКА

# СЛАНЕЧНІК

ВЕРШЫ
САНЕТЫ
БАЛАДЫ
ПАЭМА
ПРЫТЧЫ
БАЙКІ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2018

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
М21

**Маляўка, М. А.**

М21 Сланечнік : вершы, санеты, балады, паэма, прытчы, байкі / Мікола Маляўка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2018. — 392 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-581-164-1.

Падзеі ў кнізе так ці іначай звязаны з лёсам лірычнага героя. Дух жывіць еднасць з продкамі, натхняе — да сучаснікаў любоў. Роздум над пражытым і перажытым — сам-насам з сумленнем — хвалюе, радуе і засмучае: не ўсе задумы і мары, акрыленыя небам, збыліся на зямлі. Жыццё выпрабоўвала на трываласць і ў дзяцінстве, і ў юнацтве, і ў сталыя гады. Трывожныя думкі і цяпер, у новым веку, захмарваюць блакіт, адпрэчваюць сон: хапае праблемных пытанняў у розных праявах дома, на радзіме, неспакойна ў свеце — ідуць «малыя войны з вялікаю крывёй».

Лёс аднаго чалавека — у лёсе краіны. Паэтычны вобраз сланечніка, узнятага над бытам, асвячае старонкі кнігі — шчырай споведзі аўтара перад Богам і людзьмі, перад будучыняй.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-164-1**

© Маляўка М. А., 2018
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2018

# А ВЕРА ЖЫВЕ

## ДВАЦЦАТЫ ВЕК

Дваццаты век,
Трывожны век,
Ты раўнадушным быў і чулым.
Як стогадовы чалавек,
Знайшоў спакой сабе
Ў мінулым.

З вайной,
З хрушчоўскаю адлігай,
З застоем і перабудовай,
Ты закалыхваў хваляй ціхай,
Будзіў пасля
Паводкай новай.

Як быццам
Акрыялі трохі,
І тут Чарнобыль свет захмарыў —
З'іначыў лёсы і дарогі,
Па нашай будучыні
Ўдарыў.

Жыццёвы круг
Звужалі, знаю,
І Калыма, і Курапаты,
Ды я цябе не праклінаю
За грэх злачынцаў,
Век дваццаты.

Ты праўдай горкай
Абнадзеіў,
Адстаўку даў правадырам —
І нас прывёў ад Маўзалея
У пакаяння
Божы Храм.

Ты рос і крэп,
Не падаў духам,
І я цябе такім прымаю:
З вінтоўкай,
З молатам і плугам,
З бярозавай галінкай ма́ю.

Ад цесных
Гарадскіх каморак,
Ад вузкіх сцежак і прасек
Падняўся ты бліжэй да зорак,
Дваццаты век,
Касмічны век.

Ты адарыў мяне
Каханнем,
Ты акрыліў маю душу
Тугой, і светлым хваляваннем,
І верай, што ў душы
Нашу.

Я не адну
Аплакаў страту.
Лячу, пакуль хапае сілы,
Адведаць спадчынную хату,
Бацькоў і землякоў
Магілы.

Паклон зямны
За ўсё табе,
Як дарагому чалавеку:
Я твой у працы й барацьбе,
Хоць і жыву —
У новым веку.

## ВЯЛІКІ СВЕТ, А БЕЛАРУСЬ АДНА

Вялікі свет, а Беларусь адна,
Для пакаленняў маладых адкрытая.
Не раз зямлю, снарадамі разбітую,
Засейвала асколкамі вайна,
Ды зноў красуюць лён і збажына,
І мы ахоўваем яе, блакітную,
І клятваю на вернасць, і малітвамі, —
За ўсё на свеце даражэй яна.

Не ведаю, куды жыццё закіне,
Ды божа збаў памерці на чужыне.
Адна Радзіма — і адна любоў:
Я нарадзіўся тут, і шчасце проста
Вось так вяртацца, з кошыкам грыбоў,
У родны свет сучаснікаў і продкаў.

# РАДНЯ

Мы не цураемся радні —
Людзей жывых, людзей аджылых.
У нас ад продкаў — карані,
У нас ад продкаў — кроў у жылах.

Разбудзіць раніцай жаўрук,
І дбаем мы пра хлеб у полі.
У нас ад продкаў — сіла рук,
У нас ад продкаў — сіла волі.

Мы памагаем боль уняць,
Мы падтрымаем у няшчасці.
У нас ад продкаў — дабрыня,
У нас ад продкаў — сэрца насцеж.

Не засумуе з намі госць,
А ў скокі пойдзе, будзьце пэўны.
У нас ад продкаў — весялосць,
У нас ад продкаў — голас спеўны.

Шырэе пакаленняў круг,
Не зарастае ў Храм дарога.
У нас ад продкаў — мірны дух,
У нас ад продкаў — вера ў Бога.

А хто цураецца радні,
Святыні нашы зневажае, —
Чужыя мае карані,
І кроў таксама ў іх чужая.

# РОДНАЯ МОВА

Родная мова!
Словы і гукі твае чароўныя,
Ласкі,
Сілы
І музыкі поўныя.

Долю аплаквалі маці-сялянкі,
А дзяцей сваіх голасам песцілі.
Калыханкі,
Казкі іх,
Забаўлянкі
**Ласку слова** да нас данеслі.

Гуртаваліся разам паэты,
Сейбіты, кавалі і цеслі.
Гімны,
Клятвы іх,
Запаветы
**Сілу слова** да нас данеслі.

Не заглушылі чужыя харалы
Нашы малітвы святыя і песні.
Дудка,
Жалейка,
Цымбалы
**Музыку слова** да нас данеслі.

Матчына мова!
Словы і гукі твае чароўныя —
Спадчына наша галоўная,
Будучыні аснова.

## КАЗКА ПРА МОВУ

Ведаю, кожнае слова
Мае плоць і душу.
Як нарадзілася мова,
На якой гавару
І пішу?

— Ку-ку!..
— Віць-віць!.. —
Гэта зязюлі і ластаўкі
Прыляталі,
Каб слова
Вось так,
Па складах,
Ажывіць:
— Ку-ку!..
— Віць-віць!..

Шолах калосся,
Шэпт лістападу
Дабаўлялі ў слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Ша-птаць,
Ша-па-цець…

— Кур-лы!..
— Пінь-пінь!.. —
Гэта жураўы і сініцы
Прыляталі,
Каб слова

Падняць
У музычную
Сінь:
— Кур-лы!..
— Пінь-пінь!..

Грому раскаты,
Гул вадаспада
Дабаўлялі ў слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Гры-мець,
Гру-ка-цець…

— Чай-піць!..
— Па-лоць!.. —
Гэта дразды і перапёлкі
Прыляталі,
Каб слова
Знайшло
Граматычную
Плоць:
— Чай-піць!..
— Па-лоць!..

Потым у кожнае слова
Чалавек удыхнуў душу —
І нарадзілася мова,
На якой гавару
І пішу.

## БАЦЬКІ МАЕ БЕЗ СЛОЎНІКАЎ ЖЫЛІ

Бацькі мае без слоўнікаў жылі.
З карэннем вырывалі хвошч, дзядоўнік,
Касілі дзяцельнік, мурог, бульбоўнік,
Абчэсвалі шурпатыя камлі.
І ім з дзяцінства роднымі былі
Жывыя словы — дзеяслоў, назоўнік, —
А я ўсё лезу ў тлумачальны слоўнік,
Нібыта на чужой жыву зямлі.

Дзе корань слова? Дзе яго аснова?
Шукай не ў слоўніках жывое слова,
А ў лес ідзі, на кургане пастой,
Паслухай, як маркоціцца крыніца:
Зямля бацькоў — адвечны слоўнік той,
Дзе ўсё цвіце, спявае, каласіцца.

## ЗАХОЎВАЙЦЕ МАТЧЫНЫ КАЗКІ І ПЕСНІ

На роднай мове спяваюць рэчкі,
На роднай мове шумяць лясы.
І жытнія нівы ўплятаюць вечна
У гэта сугучча свае галасы.

На роднай мове зубры рыкаюць,
На роднай мове клякочуць буслы.
На роднай мове, зярнятак шукаючы,
Чырыкае і верабейка малы.

На роднай мове звіняць цымбалы,
На роднай мове жалейка гучыць.
І гэту жалейку з душою Купалы
Не можа ніякі арган заглушыць.

Людзей не згуртоўвае мова чужая,
І сэрца вярэдзіць мне неспакой:
А ты, мой дружа, гаворыш, спяваеш
І молішся Богу на мове якой?

Захоўвайце матчыны казкі і песні,
Каб некалі тут, у краі сваім,
Не сорам было перад нівай і лесам,
Зубром і буслом, верабейкам малым.

## СПАВЯДАЛЬНАЕ СЛОВА

Я болей, чым маршы і гімны,
Спакойныя песні люблю —
Пра неба разлог неабдымны,
Пра нашу красуню-зямлю.

Адметныя час і эпоха.
Вандруе без стомы душа,
І ёй жывая дарога
Мілей, чым брук і шаша.

Да ціхіх аселіц і хатаў
Ляціць з гарадскога вулля,
Не любіць парадных раскатаў
Лірычная песня мая.

Я песню і ў роднай краіне,
Бывала, ад крыўды бярог —
І на прамой пуцявіне,
І збоч, на развілках дарог.

У час узрушэнняў суровых,
У час навальнічных падзей
І спавядальнае слова
На подзвіг натхняе людзей.

## ОЙ, ЛЯЦЕЛІ ГУСІ...

*“Ой, ляцелі гусі з броду”* —
Задушэўна льецца песня.
А вада яшчэ — пад лёдам,
І не хутка лёд той трэсне.

Ветру за сцяной не чуем,
Разам з песняй летуценім.
Грэюць словы і пачуцці,
Грэюць галасы на сцэне.

Вокны абтаюць памалу,
Весялеюць нашы вочы,
Бы вясну прынёс у залу
Мілагучны хор дзявочы.

Лёд таксама быццам трэснуў,
Ціха сплыў, без крыгаходу, —
І зімою гусі з песні
*“Скалацілі ў рэчцы воду”*.

## “У РЭЧЦЫ МЫЕ ВАЛАСЫ ВЯРБА...”

*“У рэчцы мые валасы вярба…”*
Пражыта столькі, што і ў весялосці
Ёсць ад тугі-журбы шчымлівай штосьці,
Не заглушае музыкай гульба
Асенні жаль: табе — гадоў капа́.
Спяваюць пра вярбу ў застоллі госці,
А чуеш ты на свяце маладосці:
*“У рэчцы мые валасы… журба”*.

З мінулага, дзе спадчыны вытокі,
Даходзіць песень розгалас шырокі.
Ды час кладзе на ўсё сваю пячаць:
Я не паверыў бы раней, да пенсіі,
Што могуць так, па-новаму, гучаць
Старыя казкі і старыя песні.

## ПЕСНІ ТКУЦЦА

Не на фабрыцы дзесьці,
А ў вясковым закутку
Песні ў колерах ткуцца,
Глянеш — вачэй не адвесці.

Лішняе ноты ніводнай,
Свеціцца ўток каляровы,
Нітка да ніткі — як словы
Ў строі песні народнай.

Колераў голас не ціхі,
І не любяць паўтораў
Аўтары песень-узораў,
Іх выканаўцы — ткачыхі.

Рукі шчыруюць звыкла,
Рукі чароўныя радуюць —
Узлятаюць і падаюць,
Быццам рукі музыкаў.

З думкаю аб караваі
Пояс для свата тчэцца, —
Кожная нітка смяецца,
Кожная нітка спявае.

Ткуцца шырокія, вузкія,
Ткуцца ў палосы і кветкі
Ручнікі і сурвэткі,
Дываны і абрусы…

Песня льецца праз кросны,
З хаты выводзіць нібыта —
У зялёнае жыта,
У бярозы ды сосны.

## ДУДАЧКА

Ах, дудачка з крушыны —
Музычны галасок:
І звонкі спеў птушыны,
І ціхі ручаёк.

Ад нараджэння мае
І тонкі слых, і зрок —
І *сэрцайкам* спявае
Яна, чуваць здалёк.

Мелодыю люляе,
Закручвае ў вірок,
Здаецца, прамаўляе:
*“Цячэ вада ў ярок…”*

Ах, дудачка з крушыны!
І тэнар, і басок —
Адтуль, з вякоў былінных,
Музычны галасок.

## ЛЮБЛЮ ГЛЯДЗЕЦЬ НА ЧЫСТУЮ ВАДУ

Люблю глядзець на чыстую ваду,
Калі вада не мёртвая — жывая,
Праз чарацінкі дыхае, спявае.
Люблю глядзець на чыстую ваду.
Тады ў цячэнні невясёлых дум,
Як каламуць, благое ўсё сплывае.
Люблю глядзець на чыстую ваду,
Калі вада не мёртвая — жывая.

## ЗЗЯЕ ПОЎНЯ

Якая ноч!
Ніхто здалёк
Не патрывожыць тут, пры хаце.
І ні адзін яшчэ лісток
Не зварухнецца ў ціхім садзе.

Спакойна ў свеце родным спяць
Буслы ў гняздзе, у вуллях пчолы.
Заплюшчыш вочы — і чуваць,
Як блізка лётаюць анёлы.

Блакітнаватаю смугой
Трымціць святло, як быццам — ранне.
З дыханнем вечнасці самой
Зліваецца тваё дыханне.

Ніжэй касмічная мяжа,
Нібыта неба сам разведаў,
І падымаецца душа
Вышэй усё, да іншых светаў.



**МАЛЯЎКА Мікалай Аляксандравіч**

Нарадзіўся 13 снежня 1941 года ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля школы-дзесяцігодкі працаваў у калгасе, на лесанарыхтоўках у Карэліі.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Настаўнічаў у вясковых школах. Працаваў у нясвіжскай раённай газеце, на рэспубліканскім радыё і тэлебачанні, у часопісе "Вясёлка".

Піша для дарослых і дзяцей. Аўтар кніг паэзіі і прозы "Едуць маразы", "Лотаць", "Дар", "Эстакада", "Аднавякоўцы", "Зімні дождж", "Ручнічок на крыжы", "Покуць", "Салодкі лядзяш", "Папялушка", "Сядзіба, або Хата з матчынай душою", "Старая зямля", "Божы засценак", "Ой, бярозы ды сосны…", "Дзічка ў полі", "Коласаў абярэг", "Крыштальная

галінка снегападу”, “Беражыце Шыпшыну”, “Нябесны фатограф” і іншых.

Родная зямля над Нёманам — крыніца творчых задум паэта. У сваіх вершах і санетах, баладах і паэмах ён апявае дар жыцця, дар міру, дар працы, дар сяброўства і кахання. “Не засцяць свету шэрыя дажджы, не абязножвае жыццёвы верад, — цвіце сланечнік у маёй душы, дарогу асвятляючы наперад”. На гэтай дарозе — людзі, дарагія сэрцу, незабыўныя: і тыя, хто яшчэ жыве, і тыя, душы якіх адляцелі ў вечны вырай.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова (1992), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1997), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі “Мастацкая літаратура” (2002), прэміі “Залаты Купідон” (2012). Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1992), медалём Францыска Скарыны (2007), медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру”.

Выдатнік народнай асветы. Выдатнік друку Беларусі.

Жыве ў Мінску.

# ЗМЕСТ

## А ВЕРА ЖЫВЕ

Дваццаты век . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Вялікі свет, а Беларусь адна . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Радня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Родная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Казка пра мову . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Бацькі мае без слоўнікаў жылі . . . . . . . . . . . . . . . 10
Захоўвайце матчыны казкі і песні . . . . . . . . . . . . 10
Спавядальнае слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Ой, ляцелі гусі… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
“У рэчцы мые валасы вярба…” . . . . . . . . . . . . . . . 12
Песні ткуцца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Дудачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Люблю глядзець на чыстую ваду . . . . . . . . . . . . . 15
Ззяе поўня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Радаводнае дрэва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Ідзём праспектам, сцежкай палявой . . . . . . . . . . 17
Насустрач святу, сонечнаму дню . . . . . . . . . . . . . 17
Карціна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Стартуюць у бязмежжа караблі . . . . . . . . . . . . . . 19
“У ядзерным свеце жывём…” . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Чорны воран . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Помнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Пні прагрэсу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Землятрусы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Будзем жыць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
У дарозе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Жыццё на золку радавала нас . . . . . . . . . . . . . . . 27
Жыццё крутое . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Чытаю Біблію . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
За цябе адну . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
А вера жыве . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Храм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

Дзякуй Богу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Ад успамінаў светла за акном . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Я не жабрак сляпы, каб за руку… . . . . . . . . . . . . . 32
“Хто падае нам…” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Партрэты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

## ЗРАДНІЛІСЯ З ЗЯМЛЁЙ

Вечны агонь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
22 чэрвеня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Балада пра песню . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Балада пра вечнага марака . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Балада пра косы, якія не пасівеюць . . . . . . . . . . . 39
Дыміліся пажарышчы яшчэ . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Жыццё ўставала ў сонечнай красе . . . . . . . . . . . . 51
Марозіла ваенная зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
Касіў за бацьку сена дзед-сусед . . . . . . . . . . . . . 52
Вайны не помню — кадрыкі адны . . . . . . . . . . . . 53
На фронце ад цяслярства не адвык . . . . . . . . . . . 53
На хаце зорку выразаў салдат . . . . . . . . . . . . . . . 54
Клён . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Бацька дарог не любіў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Пішыце пісьмы родным і сябрам . . . . . . . . . . . . . 57
Балада пра яблыню . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Балада пра ясень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Зрадніліся з зямлёй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Не парасло мінулае быллём . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Даўным-даўно я, малады салдат… . . . . . . . . . . . . 62
На вайсковых зборах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Дзеці на стрэльбішчы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Песенька-заклічка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Губны гармонік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
За брамкай чую шум і гаману . . . . . . . . . . . . . . . 66
Царква ў паўзмроку тоне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Недалёка ад Апакаліпсіса . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
9 Мая, Дзень Перамогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Чырвоная кніга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Прыходзім мы.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Якi прыўкрасны свет!.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71

## УПРЫГОЖЫЛІ СВЕТ


Спяваюць жаўранкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Прысвячэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Балада пра мужыцкую праўду . . . . . . . . . . . . . . 75
Страцім-лебедзь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Вечны вандроўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Аўра Маўра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98
Адраджэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Дэкан . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Ён упрыгожыў свет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
А кроны зелянеюць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Вочы, у якіх жыве вайна . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Спяліў класічныя радкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Князь Уладзімір . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Басанож па зорках . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Палёт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Пчолка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Нясу за крыжам твой жывы партрэт . . . . . . . . 110
Ці чулі, як паэт на скрыпцы граў?.. . . . . . . . . . 110
Я смутак з дому і душы ганю . . . . . . . . . . . . . 111
Без слоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Стала меней… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Хачу пабыць адзін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
Колькі жыццяў пражыў… . . . . . . . . . . . . . . . 114
Зямная Мадонна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Мастак з вясёлкавай душою . . . . . . . . . . . . . 116
Ажывае пейзаж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Як ліст, напісаны бацькамі… . . . . . . . . . . . . . 118
Зорка ў небе, васілёк у полі . . . . . . . . . . . . . 120
Сёмы дзень яшчэ наперадзе . . . . . . . . . . . . . 122
Рыбакова хата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
Чарамша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Шчаслівы страх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Кружэлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129


## НА ПРАЦУ НАС НАТХНЯЕ КОЛАС


Каласок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Зялёнай сцэнай быў для нас Грудок . . . . . . . . 132

Бачыцца здалёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Тут Колас жыў — у цішыні лясной . . . . . . . . . 133
У Цёмных Лядах — светла на душы . . . . . . . . 133
У Прыстаньцы, далей ад царскіх слуг . . . . . . . 134
Баравікі ў капелюшы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Наяве ён ці сніцца, гэты цуд?.. . . . . . . . . . . . . 135
Лагодзяць слых, нібыта ўпершыню . . . . . . . . 136
У Бервянцы, над лугам і ракой . . . . . . . . . . . 136
Пад ліпамі, здаецца, бачу я . . . . . . . . . . . . . . 137
Дзядзька Юзік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Асірацеў ён, Коласаў куток . . . . . . . . . . . . . . 139
Я рад сустрэчы кожнай . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Жыццёвы шлях бяжыць за небасхіл . . . . . . . 140
Глядзіць адтуль, з далёкае вясны . . . . . . . . . 141
Ён не вярнуўся з-пад чужых нябёс . . . . . . . . 141
У гарадской кватэры — цішыня . . . . . . . . . . . 142
Гронка бэзу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
І гукі свецяцца, бывае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Рана на Івана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
На вуліцы Коласа мама жыве . . . . . . . . . . . . 145
Прачнуўся рана ён, пяснярык ніў . . . . . . . . . 147
Знаёмае ўсё тут . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
У свеце Коласавых пісьмаў . . . . . . . . . . . . . . 148
Паўлінка і Ядвіся . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Я завастрыў гусінае пяро . . . . . . . . . . . . . . . 149
Не спявайце з голасу чужога . . . . . . . . . . . . . 150
Усё часцей… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
Заблытаны сюжэтныя хады . . . . . . . . . . . . . 151
Якуб Колас на Нарачы . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Коласаў Шлях . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Воблакі плывуць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156
Касмічная прапіска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
На скрыжаванні маладых гадоў . . . . . . . . . . 158
Збірае Колас нас, яднае нас . . . . . . . . . . . . . . 158

## СВАІХ НАСТАЎНІКАЎ ЛЮБІЦЕ

Паклон вам, настаўнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
Стаяў і я, прыпынены вярстой . . . . . . . . . . . . 160
Лучынка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160

Бібліятэка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161
Закладка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Даруйце, непрачытаныя кнігі . . . . . . . . . . . . . . . . 163
Школьны жаўрук . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
Дзясяты клас — да танцаў інтарэс . . . . . . . . . . . 164
Запаў у памяць песенны радок . . . . . . . . . . . . . . 165
Настаўнік нам не завышаў адзнак . . . . . . . . . . . 165
Ён прывіваў да спадчыны любоў . . . . . . . . . . . . . 166
Яснеў за краявідам краявід . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Урокі геаграфіі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
На ўроках не стаяла цішыня . . . . . . . . . . . . . . . . 168
Не клаліся да позняй ночы спаць . . . . . . . . . . . . 168
Настаўнік наш і галадаў, і смяг . . . . . . . . . . . . . 169
Настаўніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Не было для вас чужых дзяцей . . . . . . . . . . . . . . 170
На пенсію збіралася не раз . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
Дзе вы, мае сямнаццаць?.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
На мост стары ляцелі мы без крыл . . . . . . . . . . . 173
Вучылі думаць нас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Сваіх настаўнікаў любіце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174

## ШЧЫРАВАЛА ПЧАЛА

Я спаў… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
Не выпала з жыцця майго яна . . . . . . . . . . . . . . . 177
Першы праспект . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
Дзе ты, душа, вандравала?.. . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Калі спыняецца гадзіннік . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
Песня падказала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179
Галубы паштовыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
Прыязджай з далёкай явы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
Зялёны шум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Эстакада (паэма) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182
Тайга вучыла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
“Пісаў і ў профіль, і анфас…” . . . . . . . . . . . . . . . . 205
Бывае, і боль дарагі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
Шчыравала пчала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
“Блакітнае святло — у чорным лісці…” . . . . . . . . . 206
У Карэліі — дождж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 207

Чаму я люблю навальніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Едуць маразы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 210
“Усё радзей прыходзяць пісьмы…” . . . . . . . . . . . 211
“Часцей з’яўляецца патрэба…” . . . . . . . . . . . . . 211
Даруй мне, лес . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Рамантыка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Сустрэча з лесавозам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 213

## ПАД СОНЦАМ І ДАЖДЖОМ

Белыя фіранкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
Настальгія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
У сне душа адпачывае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217
Радзіма пад дажджом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217
За лесам… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218
Вёска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219
Хата з матчынай душой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220
Родныя вокны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Каб талент меў, намаляваў бы я… . . . . . . . . . . . 222
Спяваюць мікалаўцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Звон пчаліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
Лятаюць ластаўкі ў сне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 225
Навальніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226
Мікалаўскія пясочкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Бусел мокне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
Гладышы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
Купаюць коней дзеці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
Я вечарую ў лодцы без вясла . . . . . . . . . . . . . . 230
Русалкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 230
За жытнім полем — лес сінее . . . . . . . . . . . . . . 231
Зубр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232
Крумкачы над жытам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 234
Сланечнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Аграном . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 235
Капае бульбу маладая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
Школьніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 237
У Прыстаньцы турыстаў не відаць . . . . . . . . . . 238
Дзядзькаў маналог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 238

Як даўным-даўно… 239
Высокі купал неба над зямлёй 239
Цвіце жанчына чырванню густой 240
Стажок, абскубаны ласямі 240
Адзінокі лебедзь 241
Гадзіннік з зязюляй 243
Зімні дождж 244
Крычыць надзея: “Памажы!” 244
Перавярнуўся свет 245
Папялушка 246
Яно не выпраменьвае святло 247
Цётка Воля 247
Каляжанкі 248
Баба Каця 250
Лёс 251
Яшчэ адно акно пагасла ў нас 252
Сумныя прыгадкі 252
Пустыя лавачкі 253
Дзе нарадзіўся, там і ў вечнасць ляж 255
Вянок 255
Сенакос на могілках 256
Лісток вішнёвы 257
Пад небам асеннім 258
На лавачцы, з краю 258

## ТЫ ПАЎТАРЫСЯ ЯШЧЭ РАЗ

Спыніўся час 260
Ідзеш і знаеш, што прыгожая 261
На памяць 262
А гэта не любоў яшчэ была 262
Я гляджу праз часу дымку 263
Вяснушкі 264
Халады 264
Ты — госця мая вясенняя 265
“Апошні снег…” 265
Ён не растаў яшчэ, той шлюбны снег 266
Не верыцца цяпер, што так было 266
У цэлым свеце мы адны былі 267

Шчырыя вочы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
Блакітныя аканіцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 268
Балада . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270
Валасы Веранікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270
Балада пра месячнае святло . . . . . . . . . . . . 272
Жанчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 290
Пад вішняю белай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 290
Вобраз мілы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 291
Чакаю адказу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 291
Падае снег… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
Ачуняў ад тугі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 293
Вясёлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 293
Пласцінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 294
Смага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 295
Заінелая галінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 296
Сустрэча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 296
Пасаг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 297
Вясна яшчэ ўсміхаецца здаля . . . . . . . . . . 297
Пяшчотны трыпціх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 298
Прасека . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 299
Вераб’іная ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 300
Спакойная і ціхая спярша… . . . . . . . . . . . . 301
Успамінаюцца ночы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 302
Уся ты прамяністая была . . . . . . . . . . . . . . 302
Ці ўспамінаеш ты прычал пусты?.. . . . . . . . 303
Якая ты прыгожая ў вянку!.. . . . . . . . . . . . . 303
Ты выйшла з ценю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
Пагасла электрычнае святло . . . . . . . . . . . 305
Каб пра свае пачуцці расказаць . . . . . . . . . 305
Дзякуй, Маямі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 306
Павуцінка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 306
Ты паўтарыся яшчэ раз . . . . . . . . . . . . . . . 307
Дачка спытала: “Хто мяне прынёс?” . . . . . . 308
У дзень Анёла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 308
Падушка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 309
Падары мне… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 310
На ўсходзе сонца не да сну . . . . . . . . . . . . 310
Назад азіраюся ў скрусе . . . . . . . . . . . . . . 311
Павуцінкі сонечная ніць . . . . . . . . . . . . . . 311

## МІЖ БЯРОЗАЮ І ДУБАМ


Вышэе неба, прыбывае дзень . . . . . . . . . . . . . . . . 312
Дзень вяртання птушак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 313
Не дыхае за плугам баразна . . . . . . . . . . . . . . . 313
Зірнуць бы, як рунее збажына . . . . . . . . . . . . . 314
Прапіска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315
Як пашаны знак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315
Яшчэ не ўзрушвае грыбніцы пах . . . . . . . . . . . 316
Вясной, калі вада ў рацэ спадзе . . . . . . . . . . . 316
Бэз адцвіў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 317
За Ёлавам, пры Нёмане якраз . . . . . . . . . . . . . 317
Пакінуў бацька нам зялёны бор . . . . . . . . . . . . 318
Зблiжае гора мёртвых і жывых . . . . . . . . . . . . 318
Ціха ў садзе, быццам у душы . . . . . . . . . . . . . . 318
Сплывае з лёгкім ветрыкам дымок . . . . . . . . . 319
Як Божы дар яшчэ адзін дзянёк . . . . . . . . . . . . 320
Між бярозаю і дубам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 320
Паветра ў лузе бы духмяны чай . . . . . . . . . . . 321
Прыйшоў у лугі сенакос . . . . . . . . . . . . . . . . . . 322
У жніўні прыгажэла ўсё вакол . . . . . . . . . . . . 322
Дарваўся дождж… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 323
Палохаючы, гром адгрукацеў . . . . . . . . . . . . . 323
Грыбоў у лесе — хоць бяры касу . . . . . . . . . . 324
Грыбнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 325
Божы засценак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 325
З маленства парадніўся з лесам я . . . . . . . . . . 326
Начлежнікі кляліся як адзін . . . . . . . . . . . . . . . 327
Абапал сцежкі жыта і ячмень . . . . . . . . . . . . . 327
Прыязджайце ў Мікалаўшчыну . . . . . . . . . . . . 328
Пажала лета збажыну даўно . . . . . . . . . . . . . . 329
Бабіна лета . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 329
Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
Прыйшоў Багач, сказаў: “Кідай рагач!” . . . . . . . . . 330
Палі бягуць за небасхіл . . . . . . . . . . . . . . . . . . 331
Перадзім’е . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 332
Завеі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 332
Захацелася бярозавага соку . . . . . . . . . . . . . . 333
Эцюд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 334

## ГЛЕДЗЯЧЫ Ў ВОЧЫ

Гавораць, Бог спускаецца з нябёс . . . . . . . . . . . . . . . 335
Прытча пра пілігрыма і анёла-ахоўніка . . . . . . . . . 336
Прытча пра трох братоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 336
Натхняла рэвалюцыі зара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 337
Адчужаныя сілай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 337
Камень за пазухай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 338
Анекдот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 338
Рука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 340
Нос . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 341
Трыбух . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 342
Балерына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343
Модныя падцяжкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 344
Грошы любяць цішыню . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
Зубы ў шклянцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
Ямачкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 347
Ньютан . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 348
Гарэм . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 350
Бацяны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 352
Сувенірны кубак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 353
Вясёлы зяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
З усмешкай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 355
Гледзячы ў вочы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 356

## ЗАХОЎВАЙЦЕ СВЯТЛО

Дарога, вецер, любоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357
Грашылі слепа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 358
Споведзь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 359
Зямля мая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 360
Адбомкалі вячэрнія званы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 361
Тэлефон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 361
Начлег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 362
Скупы на бульбу быў вясновы склеп . . . . . . . . . . . 363
Я падарыў суседу-землячку… . . . . . . . . . . . . . . . . . 364
Вяртаюцца яны пад родны дах . . . . . . . . . . . . . . . . 364
Як быццам мама закалыхвае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 365
Радоўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 365
Без буслінага гнязда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 366

Не спяваюць вячоркі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 367
Я абіваю з чаравікаў снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 368
Цёплае дыханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 369
Усё цячэ... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 370
Пастух . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 370
Я не ўяўляю свету без бяроз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 371
Плыве, не апускаецца да рук . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 371
На помніках — журботнае святло . . . . . . . . . . . . . . . 372
Па Бібліі, жыццё — чароўны луг . . . . . . . . . . . . . . . 373
Як у сне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 373
Жаўцее з жытніх каласкоў шлячок . . . . . . . . . . . . . 374
Вучыла мама жыць без крыўды, зла . . . . . . . . . . . . 375
Зара мая світальная . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 375
Жыву ў палоне гарадскіх муроў . . . . . . . . . . . . . . . . 376
Захоўвайце святло . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 377
Прызнаем, каб душою не крывіць . . . . . . . . . . . . . . 377
На небасхіле ўспыхваюць зарніцы . . . . . . . . . . . . . 378

***Пра аўтара*** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 379